Падчас тэматычных экскурсій у краязнаўчы пакой у Вас будзе магчымасць убачыць экспазіцыі, прысвечаныя Першай сусветнай вайне, Вялікай Айчыннай вайне.

У пакоі маюцца макет-імітацыя партызанскай зямлянкі, унікальныя прадметы, якія захаваліся з 40-х гг. 20-га стагоддзя: газета-плакат "Раздавім фашысцкую гадзіну", салдацкі шынель, афіцэрскі планшэт і інш.



Таксама мы прапануем паглядзець касцюміраваныя інсцэніроўкі беларускіх святаў і абрадаў: "Вячоркі", "Каляды", "Гуканне вясны". Чакаем усіх жадаючых!



Найбольш каштоўныя экспанаты музея:
пашпарт з часоў германскай акупацыі 1918 – 1921 гг.;
обыск брачны (дакумент аб дазволе ўступіць у шлюб 1876 г.);
кніга ”Першыя зярняткі” (беларуская граматыка для хатняга чытання 1936 г.);
падручнік логікі на польскай мове, Варшава, 1916г.;
слоўнік польска-французскі 1884 г.;
актавая бумага аб куплі-продажу зямлі 1905 г.;
пасведчанне аб воінскай павіннасці 1889г.

*Наш адрас: 231431, Гродзенская вобл.,*
*Карэліцкі р-н, аг.Краснае,*
*вул.Маладзёжная, 36*
*Тэл.(801596) 74-1-29*

*Эл.пошта: korkrasnoe@tut.by*



ДУА “Красненская сярэдняя школа Карэліцкага раёна”



# Комплексны краязнаўчы музей







аг. Краснае

2022 г.

Гісторыя родных месцаў – дарагая і блізкая сэрцу кожнага чалавека. Гэта багаты матэрыял для выхавання ў маладога пакалення грамадзянскасці і патрыятызму. Фатаграфія, дакумент, нейкі прадмет з мінулага нярэдка пакідаюць у памяці і сэрцы вучня больш глыбокі след, чым урок або параграф падручніка.




Таму вельмі часта ў навучальных установах ствараюцца музейныя пакоі, музеі. Дзякуючы плённай працы настаўнікаў, актыўнага ўдзелу бацькоў і вучняў была сабрана вялікая колькасць маўклівых сведкаў гісторыі Запольскага краю. Афіцыйнае адкрыццё музея адбылося ў 1999 годзе. У 2014 годзе рашэннем калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь нашаму музею было прысвоена званне «Народны».

**Раздзел экспазіцыі «Этнаграфія і побыт»**




**Раздзел экспазіцыі**
**«З гісторыі Запольскага краю»**




**Раздзел экспазіцыі «З гісторыі адукацыі»**




**Раздзел экспазіцыі «Ваеннае ліхалецце»**




Паважаныя наведвальнікі! Наш комплексны краязнаўчы музей запрашае дарослых і дзяцей правесці вольны час цікава і з карысцю! Мы прапануем для Вас аглядную экскурсію "Крочым па гісторыі роднага краю".






Падчас тэматычнай экскурсіі ў этнаграфічным пакоі, стылізаваным пад сялянскую хату, вы зможаце пазнаёміцца з гісторыяй праса, з гісторыяй льнаводства ў Запольскім краі, з побытам нашых продкаў.

